Алесь Пушкін



... я не магу быць напоўніцу шчасны
ў несвабоднай краіне, дзе мяне кожны год
за нешта арыштоўваюць...

# «Жыцьцё ёсьць няспынны мастацкі працэс»

***Гутарка Галіны Дубянецкай з Алесем Пушкіным***

***Хочаш уведаць мастака – убач ягоныя творы. Толькі ў выпадку Алеся Пушкіна гэтага будзе – надта ж! – недастаткова. (Прынамсі, калі маюцца на ўвазе творы ўласна жывапісу). Каб атрымаць уяўленьне пра гэтага мастака, варта было прысутнічаць у аршанскім пастарунку ў дзень апошніх угодкаў Аршанскае бітвы, дзе Аляксандр Несяргеевіч сарваў, патаптаў і выкінуў у вакно дзяржсьцяг БССР з пастарункавага інтэр’еру, а ў пратаколе напісаў, што зрабіў гэта сьвядома. Дзеля “зьмякчальных акалічнасьцяў”, – а менавіта двах дзетак-малалетак ды колішняе службы ў Афгане, – атрымаў за свой перформанс 10 сутак зьняволеньня, якія і адседзеў. “Адседжваць суткі” за свае акцыі – а часам нават адно за здольнасьць да акцыяў – Алесю даводзіцца рэгулярна, не радзей за адзін раз на год. Ён мастак у нон-кан-***

***фармізьме й нон-канфарміст у мастацтве. Ягоныя перформансы заўсёды маюць кшталт сімвалічных дзеяў, і з таго, што ўчыніў Пушкін, можна меркаваць і рабіць высновы пра сёньняшні стан грамадства.***

***З Аляксандрам Сяргеевічам яго родніць тое, што "не зарастае народная сьцяжына" да ягонае сядзібы, – і жонцы Яніне ў сьвяты выпадае роля гаспадыні вялікага фэсту, незалежна ад частавальных магчымасьцяў гаспадаркі. У шлюбе Алесь бачыць свой паратунак: "Калі б не ажаніўся, мусіць, здэградаваў бы ці эміграваў. А так – пайшло, нарэшце, спакойнае прыгожае жыцьцё, якое разнастаяць міжнародныя выставы, сьвяты – Каляды, Купальлі, – перформансы, суды… А што?" – сьмяецца, – "суды таксама яркія запамінальныя падзеі жыцьця".***

***Галіна.*** Нарэшце,

…той, хто БНР –
і тым "вандэяўцаў" разьюшыў –
з падпольля вывеў на пленэр,
Ясенін фарбаў, мройны Пуша!

Помніш такую "Гарэзію" Зьніча?

***Алесь.*** Штосьці такое трошкі помню. Ну, Зьніч тут мяне ўпрыгожвае. Дарэчы, ён быў тады, у 89-м годзе, на той імпрэзе, і на судзе, і сьведчыў.

***Г.:*** Гэта тады, як ты БНР выводзіў на пленэр? А нагадай, калі ласка, як тое было.

***А.:*** Было 25 сакавіка 1989 году. Ты ж глядзела дыск з перформансамі, – там відно, як зьбівалі студэнтаў, як тапталі шарыкі, як палкоўнік міліцыі таптаў нагамі папяровую птушку – бусла, як дзяўчат білі нагамі ў жывот, – гэта ўсё Зьніч тады засьведчыў.

…А пачалося ад ганку Акадэміі мастацтваў: я выйшаў, абвешаны плакатамі, і яшчэ дванаццаць у мяне было нарыхтавана. Але я нікога не спакушаў загадзя, бо ведаў, што людзі баяцца, яны хочуць вучыцца ў Акадэміі і г. д., а зрабіў вельмі геніяльна: ўночы вынес плакаты і схаваў у бомбасховішчы побач з цэнтральным уваходам (цяпер там кафэ), і адразу, як грамада зьбірацца стала, апрануў сам плакаты на сябе – і рушыў, і кажу: "Вось рэшта плакатаў. Хто хоча, апранайце – і за мной!" І ўмомант народ пахапаў гэтыя плакаты, сьцягі і за мной рушыў. Вельмі шмат моладзі. Плакаты наступнага зьместу: "Грамадзянін! У гэты дзень 71 год назад была абвешчаная Беларуская Народная Рэспубліка. Памятай і думай пра гэта!" Далей: "Свабоду Беларусі!", "Дзяржаўнасьць беларускай мове" (Купала, Багдановіч і Колас з завязанымі ратамі), "Досыць сацыялістычнай – адновім Народную Беларусь!" (перакрэсьлены зялёна-чырвоны сьцяг, і альтэрнатыва – бел-чырвона-белы) ды іншыя. Мне далі два гады ўмоўна.

***Г.:*** Ты быў адным з пачынальнікаў беларускага перформансу?

***А.:*** Першы самы адбыўся ў 84 годзе – перформанс памяці Малевіча, ладзілі яго Ігар Кашкурэвіч і Людміла Русава. Яны рабілі чыста мастацкія перформансы, прысьвечаныя УНОВІСУ, чорнаму квадрату, сьмерці Малевіча – хавалі Малевіча ў супрэматычнай труне і ўносілі яго ў палац Мастацтваў. Потым у Віцебску адзначалі 100-годдзе ягоных народзінаў. Потым ужо – я, ад 89-га году – мае перформансы. І самы першы – гэта сьвяткаваньне ўгодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі.

***Г.:*** А тады – конны Скарына Менскім Прасьпектам….

***А.:*** Так, гэта было на наступны год; потым, як я паехаў ужо ў Віцебск, было 7 лістапада – калючы дрот на Леніна і Маркса … І зараз, калі я гляджу, што моладзь гэтым самым займаецца, вось у гэтым годзе 7 лістапада хлопцы рабілі такія самыя перформансы, – мне робіцца вельмі-вельмі сумна. Ад 90-га году! Прайшло 17 гадоў – і такі самы калючы дрот вешаюць на помнік Леніну.

***Г.:*** Нічога не зьмянілася?

***А.:*** Жах! Яны ня ведалі, што я рабіў гэта ў 90-м годзе ў Віцебску, каля будынку абкаму партыі, я паабкручваў дротам помнікі Марксу і Леніну і плюс яшчэ чыркнуў узрыў-пакетам, там такі выбух адбыўся; мяне тут жа арыштавалі, але патрымалі і адпусьцілі, і не судзілі, нічога.

Потым быў сьцяг над Ратушай падчас путчу: уяві, у Маскве путч, а на Віцебскай ратушы я павесіў велічэзны бел-чырвона-белы сьцяг, ды замкнуў на замок люк, які вядзе на вільчык ратушы. Я быў вылез на пляцоўку, умацаваў сьцяг, паставіў пару трансфарматараў, розныя каляровыя правадочкі, маўляў: "Асьцярожна: замінавана! Не чапаць!". Тады спусьціўся, зачыніў люк на замок і ключ выкінуў. Сьцяг правісеў, пакуль міліцыянты перапілоўвалі замок, – перапілавалі, тады выбраліся на дах, а там нейкія правадочкі – абрываць, не абрываць: а раптам выбухне? – яны зноў спусьціліся, доўга раіліся, што рабіць, а сьцяг лунаў. Аж да 12 гадзінаў дня над Віцебскам 19 жніўня 1991 году.

***Г.:*** А яшчэ ж Язафат быў…

***Г.:*** А потым Язафат – вельмі важны перформанс, і вельмі прыемна, што яго помняць дагэтуль, хоць гэта было ў 95-м годзе. Я рыхтаваўся напісаць абраз сьвятога Язафата для манастыра ў Кароўніках у Полацку. І, каб самому перажыць усё тое, 13 лістапада я прайшоў крыжовым шляхам Язафата Кунцэвіча, тымі вулкамі Віцебска – да самае Дзьвіны, і калі мяне паклалі ў човен і пусьцілі, я плыў, пакуль мяне не прыбіла крыгамі да берагу. Я проста ляжаў і думаў, што абраз павінен быць напісаны як пакаяньне праваслаўных за тую трагедыю 1621 году – бо дагэтуль праваслаўныя не прызналі гэтага факту гісторыі і не пакаяліся ў забойстве уніяцкага архібіскупа. А архіепіскап Дзімітрый яшчэ пасьмейваўся: "Ну, Александр, ты много на себя взял. Этот факт нужно вообшче забыть". Я кажу: "Але, ваша высокапрыасьвяшчэнства, пачалі ж забойства манахі з Куцеінскага манастыра". Яны ж ударылі яго бердышом з-за сьпіны, потым сьцягнулі з яго адзеньне і ўбачылі валасяніцу, потым разьбілі палац, выцягнулі сьвятара і пацягнулі ў човен, у чоўне – у мяшок, і ўкінулі ў раку. Потым ужо Дзьвіна пачала сьвяціцца, і па гэтым сьвячэньні знайшлі цела Язафата й дасталі. Я гэта ўсё перажыў і напісаў абраз, і ён цяпер у Кароўніках.

***Г.:*** От шкада, не пабачыў ты абраз Язафата, літаральна днямі – на дзень памяці Язафата – асьвячоны тут у Менску ў царкве Яна Хрысьціцеля. Алена Ткачова напісала.

***А.:*** Аленцы паклон. Даўно ня бачыліся. А як абраз напісаны – на золаце?

***Г.:*** Так, залаты разьбёны німб на залатой асноведзі, гладкай. Сама выява вельмі партрэтная – здаецца, пазнаеш…

***А.:*** Ага, гэта нашая барочная традыцыя.

***Г.:*** Дык з Язафатам у цябе адбылося спалучэньне ўшчыльную іконапісу з перформансам?.. Ну, а самы славуты твой перформанс – гэта, мусіць, з тачкай гною, якую ты выкуліў перад будынкам адміністрацыі на вуліцы Карла Маркса?.. Яшчэ й вілы ўстыркнуў.

***А.:*** Так, у 99-м годзе самыя вядомыя перформансы – пра тачку гною, пра Джахара Дудаева, "Памяці Нямігі"… Перад тым былі паездкі на міжнародныя фестывалі… Ну, але перформансы – гэта рэакцыя мастака, не актора, а менавіта мастака, з мастацкай адукацыяй, які піша абразы, на тое, што сёньня адбываецца. Гэта спроба ў нейкай мастацкай форме, шляхам нейкіх незразумелых, лагічна невытлумачальных, містычных дзеяў, – як вуду, як юрод, – гэтыя падзеі шматзначна паказаць. Прынамсі, мне падаецца слушным спалучэньне стыляў афрыканскага ведзьмака вуду і праваслаўнага юрода.

***Г.:*** Гэта менавіта мастацкі чын ці больш грамадскі?

***А.:*** Чыста мастацкі чын. Гэта мае перформансы часта маюць палітычны пад-

тэкст, а іншыя людзі – на ўсіх фестывалях – робяць перформансы чыста як мастацтва дзеля мастацтва, абстрактныя. Вось яны перажываюць, напрыклад, як расьце крапіва… Ці сёлета на фестывалі “Навінкі” адна мастачка, што мае карані і ўкраінскія, і расейскія, жыве ў Амерыцы, паказала, як жанчына трапляе ў сексуальнае рабства, гісторыю пакутаў славянскай жанчыны ў ЗША – хаця сама яна гэта наўрад ці перажыла, але стварыла мастацкую форму, таксама свайго кшталту водгук на тое, што адбываецца ў жыцьці.

***Г.:*** А як у цябе Сусьветнае Зло гарэла на Купальле?

***А.:*** Сёлета я прыдумаў адну вельмі крэатыўную дзею. Мы заўсёды традыцыйна ладзім Купальле. Заўсёды прыязджаюць людзі, і мы робім абрад каля бярозы, абрад у маладым жыце, калі выбіраем Купалінку, абрад каля хлева, каля дроваў. Потым зьбіраем старыя рэчы, рыхтуем вогнішча, са старых рэчаў робім ляльку-ведзьму, наверх яе ставім. Ну, потым карагод, крупнік, умываньне-качаньне ў расе і пошукі папараць-кветкі, і раніцай ужо зноў каля вогнішча і — хто ідзе ў царкву каяцца, хто п’е гарбату і кладзецца спаць. Вось такія звычайна класічныя Купальлі.

Сёлета я, па сутнасьці, нечакана прыдумаў, як зрабіць Купальле трохі сучасным. У нас ёсьць зло, зло – гэта тое, што падмяняе сапраўднае, здаровае ў чалавеку чымсьці штучным. Я быў у замежжы, бачыў гэтыя секс-шопы, я падумаў, што непазьбежна ў век глабалізацыі гэта прыйдзе да нас. Падумаў пра тое, што любы мужчына, любая жанчына марыць пра добрае шчасьлівае жыцьцё аж да старасьці, але маладога чалавека, які наглядзіцца парнаграфічных фільмаў, які нап’ецца віагры, урэшце рэшт ня будзе хваляваць здаровае каханьне і жыцьцё з жанчынай, яму патрэбныя будуць мыліцы, пратэзы. І я прыдумаў, што сёлетнім злом на Купальскім вогнішчы, на сьвяце Купальля й будуць гэтыя мыліцы сучаснай глабальнай цывілізацыі. Я зрабіў вялікія муляжы ўпаковак віагры, бо самыя таблеткі гэтыя, 2 штучкі каштуюць 132 тысячы рублёў і не зусім рэальна іх купляць і ўкідваць у вогнішча. Мы зрабілі фота таблетак і наклеілі на вялікія кардонныя скрынкі.

…Я бяру скрынку і кажу: “Беларусы! Зірніце – нашыя беларусачкі такія прыгожыя! Няўжо нам трэба віагра? Няхай яе выкарыстоўваюць тыя немцы і тыя перасычаныя народы, якія яе прыдумалі. А тут яна ня трэба, згадзіцеся!”. І ўсе: “Так! У вогнішча яе!” Самое Купальскае вогнішча было распаленае парнаграфічнымі часопісамі, аблітымі газай, – вось тое зло, якое псуе маладыя душы. Я папрасіў участковых міліцыянтаў: калі ласка, прыносьце канфіскаваную парнаграфічную прадукцыю. Яны нацягалі мне дыскаў з парнафільмамі, часопісаў, а адзін спонсар набыў гумовую жанчыну для сексуальных уцехаў, вельмі дарагую – 300 даляраў каштуе, пампавалі яе кампрэсарам, бо яна ж мусіць быць пругкая, – і вось гэтую цётку на кол насадзілі і на вогнішча ўсклалі як ведзьму. Я ў форме пракурора кідаў у вогнішча дыскі, фалаімітатары і казаў: “Нам ня трэба гэтая зараза!”. Прыйшло шмат народу, дзеці крычалі: “ Дзядзя Саша! Алесь! Дай нам спачатку паглядзець, а тады палі!” – “Не, хлопчыкі. Вы хочаце ў 70 гадоў мець радасьць каханьня? А калі вы ў 20 гадоў ужо глядзіце парнафільмы, ужо спрабуеце ўсе гэтыя віагры, няўжо вы ў 70 гадоў будзеце нармальна кахаць сваю жоначку? Няўжо будзеце мець траіх дзяцей (што самае важнае) – здаровых, без збачэнстваў?” Таму што для мяне сталася ўжо зразумела: сям’я, у якой пяцёра дзетак, народжаных адной жонкай і адным мужам – вось здаровая сям’я. Любіць сваю жоначку – не пяцёра дзяцей ад розных жанчын, з няшчаснымі сем’ямі й паламанымі лёсамі, – а на працягу доўгіх гадоў любіць сваю жоначку, жадаць яе, нараджаць прыгожых здаровых дзетак – вось гэта будзе актуальна праз 20 гадоў, калі ў нас ужо будзе вырашана пытаньне мовы, дзяржавы і г.д. Я, у адрозьненьне ад Гэніка Лойкі, аптыміст. Паглядзіце, як мяняюцца біг-бор-

ды. Памятаеце: “За Отечество!” А цяпер – “За Беларусь!” Толькі яшчэ не на беларускай мове. Але прыйдзе й гэта.

***Г.:*** А як табе роля магчымага ратавальніка Беларусі, што адвёў табе Зьніч у сваёй “Гарэзіі”? Там, дзе згаданыя найбольш яркія постаці адраджэнцкага руху 90-х:

…і сёньня ў нас – куды ні пойдзеш –
убачыць Ісьціну у твар
ня зможа ні паганскі Воюш,
ні а-Блавачаны Сутвар…

Ні тая, што віхурыць звонка –
культуразнаўства галава,
тусовак юных амазонка –
нэа-ўніяцкая д р ы г в а …

…нудоту сходаў аздабляе,
як закаханасьці – капрыз,
нібыта сам выгнаньнік р а ю –
скандальна-геніяльны Сыс…

…і хай на грудкі ці на сьпінкі
кладуцца Музы перад ім –
не уратуе нас і Мінкін
натурабожаствам сваім…

…нібыта адыйшоў ад партый –
ды відавочна: тут – канец,
як ліхамудрствуе упарта
гіст-дыя-мацкі Дубавец…

…як і ў Антычныя часіны,
да гераізму на паклон
галодных Сіняе Краіны
вядзе няўрымсьлівы Зянон…

…і, пэўна ж, нам не дапаможа
хто прагне, — змрочны, быццам сыч,—
больш, чым “…ад можа і да можа…” –
жахліва ганарлівы Зьніч…

…а, можа, той, хто БНР –
і тым “вандэяўцаў” разьюшыў –
з падпольля вывеў на пленэр,
Ясенін фарбаў – мройны Пуша?..

Мо’ ён бліжэйшы ад усіх
да Кветкі-Папараць таемнай,
што раскрываецца няпэўна
у навальнічныя часы?..

***А.:*** Гэта трошкі сьмешны верш. Тады, на золку адраджэньня было вельмі шмат амбіцыяў. І той жа Дубавец: помніце ягоныя цудоўныя артыкулы, эсэ, але колькі там апломбу і ўпэўненасьці, што ён указвае адзіна правільны шлях. А жыцьцё паказала, што можа пайсьці іншым шляхам.

Паглядзі, як цікава здарылася: усе ягоныя сур’ёзныя прадуманыя рэчы – яны ў нас на слыху і ў памяці яшчэ. І пра перайменаваньне вуліцаў, і пра адзіны правапіс (на фоне спрэчак пра “наркамаўку” і “тарашкевіцу”) – слушныя думкі, так? Яшчэ такія справядлівыя ідэі, як, напрыклад, пайменна катаў назваць. Напачатку гэта Лукашук рабіў, цяпер Маракоў робіць. Слушныя, справядлівыя рэчы,

прамоўленыя з апломбам, з упэўненасьцю. Але чамусьці не надалося народу моцы так зрабіць, ішлі вакольным шляхам. Хаця ў нейкай ускоснай форме прызнаньне адбылося. Нават па ОНТ паказвалі Маракова, які дакладваў сьпіс рэпрэсаваных, і ня толькі рэпрэсаваных, а й катаў. А далей прэс-сакратар КДБ выступаў і расказваў, як тых, хто пасылаў людзей на сьмерць у Курапаты, потым пасылалі ўсьлед за іхнімі ахвярамі, самі ж сьледчыя КДБ пасьля ішлі туды, а потым іхнія сьледчыя – трэцяя хваля рэпрэсаваных. Я гэта сам бачыў па ОНТ, у той дзень у лістападзе, калі былі зьнішчаныя 100 чалавек эліты Беларусі ля сьценаў “амерыканкі”, – быў такі выпуск у праграме “Вести”, ці што. Дубавец пра тое гаварыў напачатку 90-х, толькі трэба было 17 гадоў, каб – патрошачку – грамадства да гэтага падышло. Але “А” было тады сказана, а “Я” не прамоўлена. Лаўку Клінтана ў нас 16 разоў ламаюць. Усё гэтае зьбіцьцё людзей, апаганьваньне крыжоў, узрывы дамоў –робяцца тымі ж структурамі… То бок мы бачым, што жыцьцё ў нечым прыйшло на кругі свае, а ўсё ж не да канца. Але на золку тым як было важна ня быць з мухамі ў носе. А рабіць сваю справу сьціпла, ціха й настойліва, – як Мікола Ермаловіч. Вось чалавек, які абсалютна без амбіцыяў, сьціпла, як пчолка, рабіў тое, што рабіў, – без патрабаваньня прызнаньня, славы. А часам культурніцкія й навуковыя акцыі чыняцца людзямі як шлях да сваёй кар’еры, як любленьне сябе ў мастацтве. Вось, да прыкладу, спадар Анатоль Белы. Шмат адкрывае помнікаў, шмат ладзіць імпрэзаў, але гэта заўсёды “Я, Я, Я”. І гэта цудоўна, што ёсьць такія прэцэдэнты як прыватныя музеі – у Старых Дарогах, у Гаранскай, у Фелікса Янушкевіча, цяпер вось прыватны музей у Полацку адкрыўся, – але людзі не павінны любіць больш сябе ў мастацтве, чым мастацтва ў сабе.

Там у вершы Зьніча: каму належыць ісьціна? – Пушкіну вялікі аванец дадзены, што, можа, ён …

***Г. :*** “…бліжэйшы ад усіх
да Кветкі-папараць таемнай…”

***А. :*** Мая Кветка-папараць – гэта вяртаньне пасьля заканчэньня Акадэміі і працы па рэспубліцы (у Віцебску, у Магілёве) на радзіму ў Бабёр, росьпіс баброўскай сьвятыні – царквы Сьвятога Міколы, – як выкананьне волі бацькоў і продкаў (бабуля верніца; тата ж быў заявіў амбітна: “Мой сын адзіны мастак у раёне, ён і расьпіша царкву”. Я сказаў: “Трэба выконваць волю і Божую, і тваю, тата, бо я твой сын”). Далей: пабудова Беларусі ў сваёй сям’і, сваім доме; – гэта адзіны зараз шлях да пабудовы рэальнай Беларусі. Адмова ад дапамогі ў культурных праектах з боку Захаду, ад грантаў: рабіць стаўку на тое, што калі народу патрэбны мастак, народ і мусіць яго пракарміць, і народ мусіць купляць ягоныя працы й даваць яму кавалачак хлеба, няхай часам бяз масла, але гэта рэальныя фермеры, мясцовыя людзі замаўляюць яму абразы, партрэты…

***Г. :*** І гэта спраўджваецца?

***А.:*** Так. Я ж з гэтага й жыву. Прынцыпова ні разу ня браў гранта, ні разу не пісаў заяўку: “Прашу на выставу ці на такі-такі праект даць такую-такую суму і трэ-тэ-тэ”. Не. Я прыходзіў да нашага фермера Баравулі й казаў: “Васіль Адамавіч, здымаем кіно. Іра Волах хоча зьняць дакументальны фільм, 13 хвілінаў. Дайце грошы, калі вам патрэбна гэта”. І ён даваў грошы, і ў канцы фільма мы пісалі: “Дзякуючы фермерскай гаспадарцы “Васілёк” і фермеру Васілю Адамавічу Баравулю быў зроблены гэты фільм”.

…З 1517 году, ад моманту заснаваньня мястэчка Бабёр у ім нарадзіўся адзіны мастак. Атрымаў адукацыю ў Акадэміі, вярнуўся ў сваё мястэчка – пасьля бурнай маладосьці, пасьля Галерэі ў Віцебску, работы ў Віцебску, у Магілёве, пасьля перформансаў тых палітычных, пасьля дзьвюх судзімасьцяў… Ажаніўся; павянчаўся ў той царкве, якую расьпісаў, – і прычакаў двух дзяцей. Вельмі марым пра

трэцяга. Трэба трошкі пашырацца – каб нас было болей, ня проста каб мы памерлі й засталіся зноў два чалавекі на Беларусі, а каб на аднаго было больш.

Зьніч тады ўсклаў надзею: можа, Пуша, Пуша… Алеісьціна – гэта, хутчэй за ўсё, як я цяпер ужо разумею, калі мне 42 гады, калі сёньня ў нас 15 лістапада 2007 году, – я разумею, што ісьціна – гэта проста чалавечае шчасьце. А яно шматкампанентнае, шматвектарнае… Я не магу быць цалкам шчасьлівы ў несвабоднай краіне, калі кожны год мяне за нешта арыштоўваюць. Калі, да прыкладу, два міліцыянты, якія атрымліваюць зарплату па паўтара мільёны рублёў, прыходзяць да мяне ў хату й пытаюць: “Аляксандар Мікалаевіч, ці паедзеце вы на сацыяльны марш?” – Я кажу: “Не”. – “Тады падпішыцеся, што мы вас праінфармавалі, што вы нясеце адказнасьць”. Я пытаю: “Вось у гэтым і заключаецца вашая праца, і за гэта вы атрымліваеце такія грошы?.. А даярка ці работніца ільнокамбінату атрымлівае 189 тысячаў?.. Ці работнік, які развозіць газавыя балоны, атрымлівае 600 тысячаў… У вас такія расцэнкі?..”

Альбо як напярэдадні выбараў 2006 году прыходзяць міліцыянты й на тры дні мяне замыкаюць у Крупскім РАУСе. За што? Каб не паехаў у Менск на барыкады, на плошчу Каліноўскага. “Мы ж цябе беражом! Ты ж наш адзіны мастак, у цэлым раёне. Паехаў бы ты туды, там бы табе горай прыйшлося. А тут у нас пасядзіш пад наглядам, жонка дзякуй скажа”. Я кажу: “Вы ўяўляеце, што вы гаворыце? Да свабоднага чалавека прыйсьці ў хату, арыштаваць яго пад ілжывую фармулёўку “брыдка лаяўся матам”… Абсурд!”

***Г.:*** Ну так, не зусім падобна да складнікаў чалавечага шчасьця…

***А.:*** Дык вось, шчасьце. Ісьціна – гэта шчасьце. Я так разумею верш Зьніча. І шчасьце – шматмерная рэч. Немажліва быць шчасным, да прыкладу, адно як сем’янін, альбо адно як мастак. Я адношуся да чатырох адсоткаў людзей, якія жывуць са сваёй улюбёнай працы. Згадзіся, гэта ж рэдка. Чатыры працэнты людзей, паводле статыстыкі, жывуць са свайго хобі – з таго, што яны любяць, – спалучаюць хобі й заробак. Я – адзін з гэтых чатырох шчасьлівых адсоткаў. Але ў гэтай краіне, дзе зачыняюцца беларускія школы, дзе караюць за беларускую мову і за тое, што людзі ня стукаюць на сваіх таварышаў, – я не магу быць напоўніцу шчасным. Шчасьце маё няпоўнае, хаця насамрэч я лічу сябе працэнтаў на 80 шчасьлівым чалавекам.

***Г.:*** Ты адзіны ў раёне мастак, гэтак пільна беражоны. А фрэска твая слынная ў царкве хоць цэлая?

***А.:*** Замазалі. 7 год не замазвалі. Я шчыра скажу: адчуваў сябе крышку ніякавата, бо ня мне дадзена судзіць, каго разьмясьціць адзясную Хрыста, каго ашую. І, можа быць, ня ў гэты час. Гадоў праз дваццаць лацьвей будзе разглядаць і меркаваць пра сёньняшнія падзеі. Я ў 96-м годзе, калі ўбачыў папраньне Канстытуцыі, парушэньне ўсіх прынцыпаў дэмакратычных, якраз пісаў гэтую фрэску “Судны дзень”, — і рука сама намалявала там менавіта такога грэшніка, і амапаўцаў за ягонай сьпінай. Гэта гарачая вясна 96-га году. І вось вынік: людзі пазнавалі, людзі сьмяяліся, журналісты пісалі, вельмі шмат гэта абмяркоўвалася на ўсіх прасторах СНД, тэлеканалы расейскія, і ўкраінскія, і нямецкія гэта паказвалі… Пакуль не прыехалі з Менску – сакратар Менскай епархіі протаерэй Мікалай Кожыч, з ім два чалавекі з лесьвіцай, з фарбамі – белай фарбай з валікам. Загадалі нашаму сьвятару адчыніць храм. Ён мне потым казаў: “Александр, но в церкви не работают, а служат. Я солдат. Приехало моё начальство и я открыл храм”. Я ж яму казаў: “Ойча, але птушкі бароняць гнёзды свае. Пчолы бароняць вульлі свае. Чаму вы не баранілі храм, які вам Господзь даў? Чаму не ўдарылі ў звон, чаму не сабралі царкоўную дваццатку? Я прыбег бы на звон, выбіў лесьвіцу з-пад ног гэтых служкаў, мяне б арыштавалі і, скажам, пасадзілі б на пятнаццаць сутак, але я абараніў бы сваю сьвятыню”. Бо гэта людзі чужыя, прыехалі вып-

раўляць тое, што ня імі было зроблена і ў чым яны дапамогі ніякай не аказвалі. Яны прыставілі лесьвіцу, замазалі фрагмент з Лукашэнкам, Філарэтам і амапам – і ўсё. Пасьля гэтага, у 2005 годзе – праз сем гадоў ад завяршэньня роспісу, – нарэшце беларускі Экзарх мітрапаліт Філарэт прыехаў і асьвяціў гэты храм, і ён стаў дзейным прыходам. Да гэтага ён не лічыўся дзейным храмам. Я трошкі пакутаваў праз тое, што так вось здарылася, але… лезьці зноў самому выпраўляць – нельга: воля Божая споўнілася. Сем гадоў Бог папушчаў гэта. Ну і слава Богу, што пытаньне вырашылася спакойна. Зафарбавалі: цяпер там белая пляма. Але… пры зьмене абставінаў, палітычнай кан'юнктуры, я думаю, будуць, будуць яшчэ цуды ў нашай Баброўскай царкве. Адсорбцыя, то бок адставаньне фарбавага слою ад тынку, ідзе паступова й незаўважна, — і аднойчы зноў людзі ўбачаць у храме цуд, зноў схаваныя постаці аб'явяцца на вочы.

***Г.:*** А хіба ўжо былі ў вашай царкве падобныя цуды?

***А.:*** Быў цуд, зьдзейсьнены мною з веданьнем тэхналогіі – каюся ў лукаўстве. Ведаючы, што сьцяна цямнее ад вільгаці і дадатку туды фарбавальніку, я закрыў памянёныя постаці цёмнай плямай – як бы зьнішчыў. Прайшло два тыдні, сьцяна высахла, і зноў усе зьявіліся на сваіх ранейшых месцах. Вось такі быў цуд, зроблены з веданьнем справы.

…Гэта ўсё можна назваць юначым запалам, тут яшчэ шмат максімалізму, пратэсту, азарту супраціву. Памятаеш, якое было новае неба, – як Кася Камоцкая сьпявала, – над новай краінай, – і якая была смачная кава, падвойная. Як нам лёгка дыхалася, як хацелася асалоды супрацьстаяньня. І гэтая асалода супрацьстаяньня засталася, напэўна, у нас у генах. Бо перажываньні маладосьці – самая невынішчальная рэч, якая ёсць у чалавеку. Першае каханьне, першае падарожжа, першыя ўдачы, няўдачы…

***Г.:*** А цяпер ужо імпэту тога няма?

***А.:*** Цяпер бы я гэтак не рабіў. Нам хапала шчырасьці, непасрэднасьці, – гэтым мне імпанаваў Сыс, што як толькі бачыў якую праўду-няпраўду, так адразу і агучваў. Ну ж, мусіць быць чалавек, які скажа, што кароль, да прыкладу, голы. Нам не ставала толькі аднаго ў тыя часы – такту. Па-юнацку амбіцыйна і часам крыўдна для ўсіх мы рабілі свае перформансы, дзе заўсёды прысутнічаў момант, назавем яго так, выкрыцьця. А больш тонкае, – гэта ўсё-ткі ўбачыць у чалавеку, як зараз я бачу, спачатку лепшае, а потым горшае. Я грашыў гэтым: непасрэдны хлопец, які бачыў і выкрываў, выступаў першы, маўляў, ды ё-маё, што гэта такое, свабоды няма! Надзяваў плакаты і йшоў на вуліцу. Чаму я пайшоў на вуліцу з першым перформансам? Я спачатку сумленна гэтыя плакаты паказаў рэктару В. Шаранговічу і кіраўніцтву Акадэміі, яны сказалі: "Не, няможна гэта ў Акадэміі выстаўляць". Я цалкам шчыра кажу: "Тады я выстаўлю гэта на вуліцы, панясу іх па праспекце". Яны пасьмяяліся, не паверылі. Тое самае было на 60-годдзе замены акупацыі, ці то сьвяткаваньне 3 ліпеня так званага "вызваленьня" – я называю "замена акупацыі", з нямецкай на расейскую. Я пайшоў у Нацыянальны мастацкі музей да Пракапцова, дырэктара, і кажу: "Рэальная рэч – 60-годдзе Перамогі. Вы выстаўляеце карціну Волкава "Вызваленьне Мінска". Давайце выставім партрэты дзеячоў, такіх як ксёндз Гадлеўскі, Усевалад Руцкі, Міхал Вітушка, Філістовіч, Расьціслаў Лапіцкі, Іван Шанько, Якуб Харэўскі, – герояў нашых, якія змагаліся за незалежнасьць Беларусі, і на 60-годдзе Перамогі было б вельмі прыемна бачыць аблічы тых, якія ўклалі сваю рэальную лепту ў беларускую незалежнасьць". Ён сказаў: "Не, я не дазволю табе такую выставу ў сьценах музею". – "Падпішыце". Падпісаў, што мне ў выставе адмоўлена. Я выставіў гэта на сходах музею. У 5 раніцы. Выстава пратрывала 45 хвілінаў. Але рэакцыя мая цалкам натуральная: "Ах, вы забараняеце, тады я выйду да людзей з гэтымі плакатамі, з гэтымі творамі".

***Г.:*** А хоць хто пабачыў тую выставу?

***А.:*** Бачыла Юлія Дарашкевіч, бачыў Сяргей Ёрш і нарад міліцыі, які быў выкліканы сонным ахоўнікам Нацыянальнага мастацкага музею. Ён убачыў выстаўленыя карціны, бел-чырвона-белы сьцяг і тут жа выклікаў амап, амапаўцы прыбег і пацягнулі мяне ў Ленінскі РАУС. Да 12-й патрымалі. Ну, гэта ж не хуліганства, гэта ж выстава. У кішэні ў мяне быў адзін-адзіны дакумент: адмова ў выставе ў Нацыянальным мастацкім музеі, падпісаная дырэктарам Пракапцовым. Яны паціскалі плячыма, ня ведалі, што рабіць. Пасадзілі ў машыну, завезьлі на электрычку разам з карцінамі, пасадзілі ў электрычку, што пад'ехала тут жа, я не пасьпеў нават білет купіць, білеты не правяралі. У Бабры я вылез з работамі, там стаяла другая міліцэйская машына, якая завезла мяне дахаты.

Вось такі юнацкі максімалізм. Не ставала ў маладосьці такту, не ставала здольнасьці ўбачыць добрае ў чалавеку. Вазьмі любога нашага чалавека, які шчыруе на ніве беларускай культуры. Так, ня ўсе анёлы, ня ўсе сьціплыя, ва ўсіх ёсьць нейкі шкілет у шафе. Але ёсьць у кожнага добрыя, прыемныя, пазітыўныя рысы. Трэба, каб адно другое не засланяла, каб усё-ткі спачатку бачылі добрае, потым справядліва бачылі злое й казалі: "Давайце далей расьці, давайце вучыцца, давайце ўдасканальвацца, давайце памаленьку, памаленьку лепей рабіць нашае жыцьцё"…

***Г.:*** Дык, можа, да прыкладу, Філарэт нешта добрае робіць…

***А.:*** О, столькі храмаў – 1200 храмаў адчыніў за гэты час, з 91-га году. Урэшце рэшт, давай шчыра скажам, пры павышэньні дабрабыту насельніцтва, пры павышэньні зарплаты, калі б ня вера, – колькі было б наркаманаў, п'яніцаў і людзей, якія проста выхопліваюць пісталеты й страляюць адзін у аднаго – у чэргах, у пробках аўтамабільных. Толькі вера, толькі храмы нас ад гэтага ратуюць.

А давайце ўспомнім самы першы – ў Белсаўпрофу – фестываль духоўнай музыкі… Плакат з выявамі Кірылы й Мяфода – як ён нас уражваў! Уявіце – вялізны 60х80 плакат, і двое сьвятых намаляваны, са зьвіткам, з літарамі АБВ… Як гэта было цудоўна! Мы ўпершыню ўбачылі кананічны абраз праваслаўны (такім накладам і такі вялікі). Я быў тады студэнтам Акадэміі – і я ўбачыў для сябе візантыйскае пісьмо, убачыў, як пішацца абраз, – так, з гэтага плакату! Вось адкуль я пачаў цікавіцца абразом. Потым убачыў абразы Паўла Жарына – гэта самы лепшы зараз у нас кананічны іканапісец. Адсюль мы ўсе пайшлі вучыцца пісаньню абразоў, набіваць гузакі, вывучаць візантыйскі канон. Пасьля былі выставы абразоў, і таксама сучаснага абраза. Было далучэньне й вучоба адно ў аднаго. Я ўбачыў абразы Алеся Лася – вельмі добры майстра. Цяпер я стаю на тым, што абраз калі пісаць – дык беларускі, не калькаваць расейскі. У нас ёсьць нашая свая цудоўная школа, беларускі абраз вельмі адметны – з разьбёным ляўкасам, залачэньнем… з наіўнымі ціхімі тварамі, кірпатымі насамі… Добры Бог з сівой барадой, маляваны вясковым мастаком… Няхай ён будзе ня так тонка выпісаны, як гэта робяць іканапісцы ў Маскве ці на Афоне, няхай будзе крыху грубаваты, з гэтымі добрымі сумнымі вачыма, але гэта родны, наш Гасподзь…

***Г.:*** Ёсьць твае абразы ў цэрквах?

***А.:*** У беларускіх цэрквах – у Бабры, у Кароўніках, у Берасьці ў царкве Сьв. Міколы. Яшчэ ў царкве ў Антверпене і ў прыватных зборах. Вельмі шмат абразоў рэстаўраваў. Цяпер пішу Сьв. мучаніка Трыфана, заступніка паляўнічых, на замову аднаго праваслаўнага чалавека, паляўнічага.

***Г.:*** Вось жа праваслаўны, а палюе братоў сваіх меншых, забівае…

***А.:*** Дзіўная рэч, праўда?.. Сьвяты Трыфан, з сокалам у руцэ, гоніць па горках розных мядзьведзяў, ласёў і аленяў – так яго традыцыйна малявалі.

***Г.:*** А ў Магілёве ты ж расьпісваў каталіцкі катэдральны сабор?

***А.:*** Так, чатыры з паловай гады працаваў у складзе Беларускай каталіцкай грамады пад кіраўніцтвам Віктара Лукашэвіча, рэстаўратара першай катэгорыі. Было адрэстаўравана каля 2,5 тысячаў квадратных метраў старога жывапісу і

створаны шэраг новых фрэсак у барочным стылі. Гэта Сьвятая Цэцылія (ў 1994 годзе была мной напісаная на слупе каля хораў), Сьв. Юда Тадэвуш – памочнік у справах безнадзейных, – Сьв. Антоні Падуанскі (ў 1995 г.)… І ў 1996 годзе з блаславеньня яго эмінэнцыі кардынала Казіміра Сьвёнтка я напісаў вялікі плафон – 40 кв. метраў, з фігурамі 40 гістарычных персанажаў (Папы Рымскага, кардыналаў, біскупаў, нунцыяў) на сюжэт, прысьвечаны кардыналу Сьвёнтку.

І вось праца была зробленая, і гэта быў мой самы першы манументальны аб'ект. І гэта быў цуд. Была такая пара! Было Адраджэньне! Выдаваліся кніжкі – Сагановіч, Ермаловіч, Геніюш… Беларусы рамантавалі свае храмы. Усе размаўлялі на мове. Школьніцтва ішло ўгару. Газеты, радыё, тэлебачаньне, "Беларуская маладзёжная", хіт-парады, радыё 101,2 было беларускамоўнае на FM.

Галерэя была ў мяне ў Віцебску. Прыязджала столькі замежнікаў, ладзіліся Шагалаўскія, Малевічаўскія пленэры. "Артпрагноз" мы зладзілі 25 сакавіка 96-га году – сумесную акцыю мастакоў, паэтаў, музыкаў, танцораў, кулінараў і фармаколагаў, дзе прагнозам сталася ўзаемапранікненьне ўсіх мастацтваў… І гэты культурны прасьвет скончыўся ў 95 – 96-м гадах. Галерэю зачынілі. Магілёўскую фрэску "Глорыя кардыналу Сьвёнтку" завесілі прасьцінай. (А нядаўна не задрыжэла рука пробашча Рамана Факсіньскага зусім замазаць плафон: і нашага кардынала, і Папу – першую на Беларусі мастацкую выяву Папы Яна Паўла II, – і нашых беларускіх праведнікаў). Скончылася свабода беларуская, пачаўся адкат да савецкай ідэалогіі, імперскай палітыкі маскоўскай. Да задушлівай атмасферы цэнзуры й прыгнёту. Я памятаю выбары 94-га году, я быў назіральнікам і бачыў, што справядліва выйграў Лукашэнка, – але ён выйграў на 5 гадоў. Пяць гадоў дастаткова, каб накіраваць краіну, кудысьці яе вывесьці, і ўрэшце рэшт, мусіць адбывацца ратацыя кадраў, ня трэба думаць, што ты адзін толькі прышпілены, і будзеш весьці гэтую Беларусь да скону – свайго ці Беларусі. Цяпер жахлівая сітуацыя – ад аднаго чалавека залежыць незалежнасьць Беларусі.

Беларусь перажывае цяпер няпростыя часы. Думаю, што яна зараз, канешне, суверэнная і моцна стаіць на нагах. Але як гэта ўсё хістка. І мне здаецца, што ніжэйшае кропкі свайго падзеньня Беларусь яшчэ не дасягнула. Усе суседнія краіны ў свой час гэта перажылі, там ужо ня будуць баяцца гэтых газу, нафты, там людзі ўжо плацяць па еўрапейскіх коштах. А ў нас гэта вельмі й вельмі балюча зараз. Такое ўражаньне, што мы ўсё яшчэ вагаемся: ці то прамяняць цёплае ўтульнае жытлё на абстрактную свабоду, незалежнасць, а ці….

***Г.:*** Але ж вера ёсьць?..

***А.:*** Вера заўсёды была. Што да мяне, я ніколі не сумняваўся, што буду шчасьлівы. Што паступлю ў Акадэмію. Што стану вядомым мастаком. У Віцебску, набываючы мальберт, сказаў: "Дайце мне мальберт і я праслаўлю гэты горад!" Вось такі быў самаўпэўнены, 24 гады мне было. Чытаю свае дзёньнікі: там асноўная тэма – да таго, як ажаніўся, – тэма самоты. Самоты й непадзеленасьці. Гэта было пытаньне №1, якое мяне хвалявала. Пасьля шлюбу стала найперш хваляваць і мучыць іншае: так, я шчасьлівы… але ці патрэбны я свайму народу – прынамсі там, дзе я жыву? Шмат бывае цяжкіх дэпрэсіўных дзён, калі бачыш заняпад, сьпіваньне людзей, якім не да мастацтва… І як цешыцца душа, калі які-небудзь чалавек, столяр, замаўляе напісаць партрэт сваёй жонкі і вешае яго з любасьцю, пяшчотай і пры гэтым вялікай пашанай да мастака. Ці як, да прыкладу, пайшоў дачушцы пашпарт выпісваць, і начальнік аддзелу пашпартоў, маёр міліцыі, кажа: "Ну, Аляксандр Мікалаевіч, мы вас усё пасьвім, усё арыштоўваем, а карцін вашых так і ня бачылі. Прынясіце хоць карціны, можа, купім". І я з задавальненьнем прынёс ім карціны, і яны казалі: "Ну во, дзесяць гадоў мы вас пасьвім, і ўсё даказваем, і на сутках вы ў нас сядзелі, а вось толькі цяпер убачылі вашыя

работы”. Мне было вельмі прыемна, што на-рэш-це мастак заўважаны, а ня проста чалавек, які стаіць у іх на ўліку ў кампутары як рэвалюцыянер, звадыяш і агент НАТА і ЦРУ.

***Г.:*** А купілі хоць што-небудзь?

***А.:*** Зьбіраюцца купіць дзьве работы. Старшы лейтэнант чакае мужа з Менску, каб разам прыняць рашэньне – гэта ж усё-ткі дорага, набыць карціну, скажам, 60Х80, мільён які з нечым, ну, акварэль тысячаў 300-400 ці каля таго; а начальнік чакае прэміі ў канцы году, бо таксама ж няпроста патлумачыць жонцы, а чаго ты ўзяў ды купіў гэтую карціну. Але тут ёсьць аптымістычны момант: мая праца патрэбная людзям.

Гэта прыватнасьці, міліцыянты. Асноўныя ж мае памочнікі й мецэнаты, пакупнікі маіх карцінаў – гэта тая ж нашая мясцовая бедная інтэлігенцыя. Гэта хірург Сяргей Хацько, які ў свой час – у 97-м годзе – за 5 даляраў купляў у мяне карцінку, калі ў самога зарплата 30 даляраў. Успамінаецца Ван Гог, “Партрэт доктара Рэя” – той доктар, што купіў карціну за 8 франкаў. Краязнаўца мясцовы Андрэй Ляхновіч, настаўнік, выгнаны са школы, купляе тры эцюдзікі з відамі возера Сялявы. Яму гэта трэба. Вось у чым, можа быць, і шчасьце, і праўда жыцьця, пра якую напісаў Зьніч: адчуваць сваю патрэбнасьць мясцоваму люду. Патрэбны мастак? Ну, ёсьць мастак.

***Г.:*** Ты працаваў у цэрквах праваслаўных, і каталіцкіх, і уніяцкіх: тваё мастацтва па-над канфесійнымі рамкамі?

***А.:*** Як і жыцьцё. Ажаніўся з каталічкай Янінай Дэмух з роду Жывіцкіх (у яе ёсьць пацьверджаньне шляхецтва ад 1903 году), яна захавала традыцыі свайго народу, яна і панцак робіць у вігілію, і падкалотку – ведаеш такія беларускія посныя стравы? Смажаныя качкі робіць на Каляды ў печы, з яблыкамі, размаўляе на беларускай мове. Пазнаёміўся з ёю падчас працы ў Магілёўскай катэдры. Яна прыйшла ў касьцёл, а я пыльны ўвесь, у вапне, у пяску, бо тынкаваў сьцяну пад фрэску, зьлез з рыштаваньняў у канцы працоўнага дня. Яна паспагадала стамлёнаму, засьмягламу мастаку, пачаставала мяне сьлівамі. А я задумаўся: от ёсьць жа чалавек… Два гады я з ёю сябраваў, а тады, сабраўшы грошай, купіў хату і, толькі купіўшы хату, паехаў у сваты: бо няма дому – няма сям’і. Міколка зьявіўся пасьля шасьці гадоў нашага сумеснага жыцьця.

Калі мы павянчаліся, старыя бабулі кланяліся нам і казалі: “Віншуем вас з законным шлюбам!” Як гэта было прыемна чуць. Уяўляеш, што значыць у маленькім мястэчку быць, як належыць, расьпісаным, вянчаным, мець дзяцей хрышчоных, хадзіць у царкву… То ж у нечым ставіць кропку маральнага адліку – там, дзе жывуць так, бяз шлюбу, шмат хто з моладзі п’янствуюць, дзеткі кінутыя, ў бацькоў… Я – адзіны мужчына, які водзіць свайго сына ў дзіцячы садок. Усіх астатніх – мамы й бабулі.

У маленькім мястэчку вядзеш цалкам празрыстае жыцьцё. Над хатай – бел-чырвона-белы сьцяг. Неаднаразова арыштоўвалі, прыязджала машына міліцэйская, забірала, а народ дзіваваўся на ганку крамы: вось яны разварочваюцца, з міргалкамі, як належыць, – “Во, да Пушкіна паехалі”. Мінае тры дні, я выходжу на волю, зьяўляюся ў краме – і ўсе змаўкаюць, павісае маўчаньне ў краме, мёртвае. А адзін дзядок аднойчы шчыра выказаўся: “Калі ўжо гэтага Пушкіна забяруць ды ня выпусьцяць?” Я яму кажу: “Дзядзя Жора, вам стане лягчэй, калі яшчэ адзін дом у мястэчку будзе з выбітымі вокнамі, з дварам, зарослым бур’яном, і ня будуць вісець пялюшкі, і ня будуць квітнець у палісадніку кветкі? Вам будзе лягчэй?” – “Не, Саша, я гэтага не гаварыў”… От такі народ. Няўжо гэтаму пажылому чалавеку камень з душы зваліўся б, калі б мяне забралі й ня выпусьцілі, а жонка плакала-плакала б, ды і зьехала, і хата засталася б з праваленым дахам, з паваленым плотам і бур’яном у чалавечы рост?..




*Сям'я Пушкіных.*

***Г.:*** Пэўна, з масы вытыркаешся – вось людзям і коле вочы.

***А.:*** Але я выбраў жыцьцёвы шлях. І, ведаеш, яны мяне па-свойму любяць. Я іх і ўшчуваю, і кажу ім: "Хлопцы, навучыцеся нешта рабіць!" А то адзін прапануе: "Я прынясу табе рамкі", другі: " Я прынясу сякеру, пасяку дровы". Я кажу: "Паслухай, навучыся дом складаць з камянёў акуратненька, насьцілаць падлогу, сьцены абіваць вагонкай, капаць калодзежы. Прыходзь і гавары: "Алесь, я табе выкапаю калодзеж. Потым са мной разьлічышся". Ніхто, кажу, з вас – дзесяць гадоў я вас ведаю – не прыйшоў да гэтай эвалюцыі, што трэба авалодваць нейкай прафесіяй, каб навучыцца нешта рабіць. Не, вы толькі можаце чорнарабочымі, толькі прынясі-падай, вы толькі пасекчы дровы… Ну што гэта такое, хлопцы, гэта – дэградацыя". Рэгулярна выходзяць з турмы, рэгулярна ходзяць шукаюць такой вось працы. І тое самае на радзіме Сыса, дакладна, як і ў нас. Я кажу: "Ну, чаму вы ня сядзеце – яшчэ ж не стары чалавек – за гэты кампутар, за гэты трактар? Урэшце ж ёсьць будаўнічыя прафесіі: дахоўшчыкі атрымліваюць на будоўлі аграгарадкоў паўтара мільёна рублёў – вось, навучыся класьці дахоўку, дабротна, каб яе ніколі вецер не сарваў, — вось выйсьце. Муляры патрэбныя, кубаметр кладкі каштуе 35 даляраў – складзі камяні акуратна, роўненька, адзін да аднаго. Чаму не вучыцеся?.."

А ёсьць цудоўныя людзі, з якімі я сябрую: фермеры, краязнаўцы, настаўнікі. Жыцьцё ёсьць няспынны мастацкі працэс, гэта вельмі важна. Ёсьць цудоўная настаўніца Алена Ржэвуцкая, сяброўка маёй жонкі, прыносіць мне кніжкі, – дык вось яна зрабіла зараз такі ўчынак: узяла трэцяе дзіцё ў сям'ю. Двое сваіх, і трэцюю ўзяла дзяўчынку ад сваякоў п'яніцаў, удачарыла, даглядае, пакінула працу ў школе, займаецца толькі дзецьмі. Што гэта, як гэта патлумачыць? Можа, і наш тут уплыў ёсьць. Бо калі ў мястэчку ёсьць кропка адліку, – напрыклад, мая сям'я, – гэта ўжо мяняе кшталты тутэйшага жыцьця. І ў гэтым я найперш бачу сваю місію.

…Так, дзівак ёсьць, малюе карцінку, яны паціскаюць плячыма: няўжо нехта

купіць за мільён? Яны мала верацъ, што з гэтага можна пражыць. Сапраўды, і бедна жывем, і рэдка гэтыя продажы бываюць. Але ёсьць кропка маральнага адліку. Ёсьць чалавек, якога ня бачылі п'яным, які займаецца нейкімі рэчамі, ведае гісторыю, які шануе свой Бабёр, ведае герб, сьцяг, які водзіць сына ў дзіцячы садок, які нешта будуе… Ладзіць Каляды, ладзіць Купальле. Гэта ж навідавоку, усе ж адно аднаго ведаюць.

***Г.:*** А як у нядзелю: ты да царквы, а жонка да касьцёлу?

***А.:*** На жаль, у нашым жыцьці ня ўсё складваецца так, як хацелася. Я вельмі марыў знайсьці беларуску сьвядомую праваслаўную, што была б і ў побыце праваслаўная, і ў мове сьвядомая беларуска. Але Бог мне яе не паслаў. А паслаў мне Бог цудоўную каталічку. І ў нас атрымалася такая канфесія. Калі мы пабраліся, я ёй адразу сказаў: “Яначка, я ня буду ніколі цябе “прыводзіць”, як ад нас патрабуюць праваслаўных, маўляў, прывядзі жану ў сваю веру і толькі тады вянчайся. Не, канешне. Я хачу, каб ты заставалася каталічкай. Калі Бог пашле нам хлопчыкаў, будзем хрысьціць іх па бацьку ў праваслаўе, калі дзяўчынак – няхай насьледуюць веру сваёй мамы”.

І вось нам Бог паслаў хлопчыка і дзяўчынку. Хлопчыка мы хрысьцілі ў нашай царкве Сьв. Міколы пад імем Мікола, а дзяўчынку мы хрысьцілі ў касьцёле Сьв. Антонія Падуанскага ў Талачыне, на Усьпеньне Божае Маці – Унебаўзяцьце Панны Марыі – пад імем Марыя. І таму такі ў нас распарадак: мы з сынам у нядзелю ідзем у 9.30 у праваслаўны наш баброўскі храм, а калі трошкі падрасьце Марылька, Яначка будзе езьдзіць з ёю ў прыходскі свой храм а 14 гадзіне.

***Г.:*** Як трымаецца малады прыхаджанін?

***А.:*** Ён і прычашчаецца, і ручкі складвае, як навучыла яго сяброўка, на два гады старэйшая, дачка сьвятара. Яна яго, хоць і малодшага, заўсёды ставіць паперадзе сябе, як хлопчыка, – правільна выхаваная папоўская дачка. Для Міколкі ў царкву ісьці – гэта, па-першае, пабачыць Аню. Вось мы выбіраемся, бяром з сабой якуюсь машынку, а там дзеткі бавяцца разам, на лаўку ўзьлезуць, ножкамі боўтаюць, а як час – бягуць да прычасьця, а тады, з прычасьцем ужо, хлопец мой, шчасьлівы, імчыць да таты.

…Калі я марыў пра дзяўчынку, я зьдзейсьніў пілігрымку да Маці Божай Ружастоцкай – гэта цудатворны абраз, і там я маліўся, каб у нас была дзяўчынка Марыя. Калі я вярнуўся з гэтае пілігрымкі, пайшоў у касьцёл – Яначка была цяжарная – і сказаў пробашчу: “Ойча Аляксандар, вось, памаліцеся, каб у вашай парафіі зьявілася прыхаджанка Марыя Пушкіна”. І вось ужо дзесяць месяцаў яна ёсьць: Бог пачуў нашыя малітвы. І сёлета я напісаў абраз – дасьць Бог, у “Дзеяслове” яго пакажуць (*гл.* на апошняй старонцы вокладкі) – на ім адлюстраваны момант выношваньня новага жыцьця. Тут дзяўчына-маці ў паўсьне-паўяве, у левітацыі – яна ж лунае, – і сьпіць на доле маленькі сынок, Міколка, – гэта ўсё перажыта.

***Г.:*** А Міколку падабаюцца татавы карціны?

***А.:*** Заўсёды, калі ў нас госьці, і я паказваю ім свае работы, сын любіць каментаваць: “Вось гэта мама, і я сплю”; “А вунь я голенькі ў лазьні”; “А вось наш Бабёр”; “А вунь тата мой”, – паказвае і сьмяецца. Ёсьць вялікі абраз у мяне, дзе намаляваная вясковая настаўніца, у руцэ ў яе газета “Наша Ніва”, – на фоне восеньскага пейзажу, дзе і п'яніцы каля віна-гарэлачнай крамы, і каля сельсавету старшыня сельрады, і мітынг якісьці з зялёна-чырвонымі сьцягамі, і каля помніка ветэраны, і на тартаку зьбіваюць палеты, і на сьпіртзаводзе гоняць сьпірт, – і намалявана тамака ўдалечыні маленькая хатка з бел-чырвона-белым сьцяжком, і каля хаты стаіць мастак у капелюшы з мальберцікам і побач маленькі хлопчык у сіняй куртачцы. І Міколка радасна падбягае і ўсім гасьцям паказвае: “Гэта вось я, а гэта тата”.